■ Векапомнае

# АПОШНІ З ГРУПЫ «ДЖЭК»

Тое, што разведка Савецкага Саюза была адной з найлепшых у свеце, яшчэ раз пацвярджае і экспазіцыя, часова адкрытая ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны

**Прымеркаваная да стагоддзя з дня ўтварэння органаў дзяржаўнай бяспекі выстаўка расказвае аб дзейнасці чэкісцкіх фарміраванняў на акупаванай тэрыторыі Беларусі ў гады ваеннага ліхалецця.**



Музейныя супрацоўнікі ўручылі Генадзю ЮШКЕВІЧУ, які змагаўся з гітлераўцамі ў складзе легендарнай савецкай дыверсійна-разведвальнай групы «Джэк», яго партрэт, створаны партызанам-мастаком у далёкім 1944-м.

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

У дзень яе адкрыцця дапоўнілі экспазіцыю яшчэ два цікавыя прадметы. Ветэран Вялікай Айчыннай вайны Генадзь Юшкевіч перадаў музею партаманет і кніжачку для фотаздымкаў, якія ў свой час зрабіў для яго ваеннапалонны немец. Паходным «фотаальбомам», дарэчы, так і не давялося скарыстацца — фатаграфавацца разведчыкам было забаронена.

Генадзь Юшкевіч — апошні з дыверсійна-разведвальнай групы «Джэк»: той самай, якая па выніковасці і жывучасці ў тыле ворага была занесена ў англійскі каталог найлепшых разведгруп свету XX стагоддзя. Толькі дваім з дзесяці разведчыкаў, першымі закінутых на тэрыторыю Германіі, пашчасціла вярнуцца дамоў. Напалеона Рыдзеўскага ўжо даўно няма ў жывых.

А між іншым, калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, Генадзю Юшкевічу ішоў 13-ы год. Шукаць партызанаў яго прымусілі абставіны: бацька ў першыя дні вайны загінуў у партызанскім атрадзе, маці была павешана падчас першага масавага публічнага пакарання, якое адбылося ў Мінску 26 кастрычніка 1941 года. У падлетка засталася толькі сястра...

— Мы былі так выхаваны: як гэта, прыйшоў фашыст і мы будзем з ім мірыцца? — тлумачыць сваё рашэнне ветэран. — Тым больш да вайны я скончыў усе абаронныя гурткі ў Палацы піянераў: добра страляў, ведаў кулямёты «Максім» і Дзегцярова.

Шукаючы партызанаў, Генадзь Юшкевіч апынуўся ў вёсцы Ляхавічы, што недалёка ад Станькава. Жыў у бабы Анэты, якой дапамагаў па гаспадарцы, і ў той жа час быў сувязным партызанскай групы Мінакова. Восенню 1942 года ён стаў паўнапраўным яе членам. Народнаму мсціўцу толькі споўнілася 13 гадоў...

Адной з першых група «Джэк», куды пасля быў залічаны юны патрыёт, у колькасці дзесяці чалавек была закінута на тэрыторыю Германіі. Трымалі пад назіраннем камунікацыі ворага, ажыццяўлялі дыверсіі...

— Калі загінуў камандзір групы Павел Крылатых, з забітага знялі пінжак, бо ў кішэнях магла застацца каштоўная інфармацыя, — успамінае былы разведчык. — Мікалай Шпакаў, які замяніў камандзіра, сказаў, што, паколькі я самы малады і мне абавязкова трэба выжыць, я павінен быў яго надзець: маўляў, двойчы ў адно месца куля не трапляе. У гэтым пінжаку я прайшоў і агонь, і ваду, вярнуўся ў сваю часць.

Ветэран з горыччу ўспамінае, як яны выжывалі ва Усходняй Прусіі. Прызнаецца, было страшна: «Страх ёсць ва ўсіх здаровых людзей, — кажа ён. — Не страшна толькі вар'яту».

Нечаканасцю для Генадзя Юшкевіча стаў падарунак, які яму паднеслі супрацоўнікі музея. На напісаным алоўкам партрэце адлюстраваны ён, юны герой. Ветэран памятае, што малюнак быў створаны ў 1944 годзе ў лесе ва Уздзенскім раёне Генрыхам Бржазоўскім. Дарэчы, палотны мастака, які сам быў партызанам, упрыгожваюць экспазіцыю. Таксама тут можна ўбачыць асабістыя дакументы і рэчы адважных байцоў і камандзіраў, ваенны рыштунак, зброю, узнагароды. Зацікавяць наведвальнікаў і ўспаміны камандзіраў спецатрадаў, старонкі газет і рукапісных партызанскіх часопісаў, карты ваеннага часу, іншыя прадметы з фондавых калекцый.

— Органы дзяржаўнай бяспекі ўнеслі велізарны ўклад у станаўленне і развіццё партызанскага руху, на тэрыторыі Беларусі ў тым ліку, — адзначыў падчас адкрыцця выстаўкі **дырэктар Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны Дзмітрый ШЛЯХЦІН.** — Прафесіяналы гэтых структур, якія змагаліся з ворагам на нашай зямлі, безумоўна, надалі партызанскаму руху тое аблічча, пра якое мы ведаем сёння. Матэрыялы, прадстаўленыя ў экспазіцыі, дазваляюць паглыбіцца ў гэтую тэму і ацаніць ролю не толькі ўсёй структуры органаў дзяржбяспекі, а і тых карыфеяў, патрыярхаў, якія служылі там падчас падзей Вялікай Айчыннай вайны.

Як заўважыў **вучоны сакратар музея Валерый НАДТАЧАЕЎ,** музейныя залы не могуць умясціць тую колькасць прадметаў, якімі валодаюць фонды ўстановы. «Дзякуючы такім часовым экспазіцыям мы дэманструем новыя грані барацьбы, якую вёў наш народ у гады акупацыі, — лічыць ён. — Паказ ролі і месца чэкісцкіх фарміраванняў — гэта не спроба сказаць, што ўсё атрымалася дзякуючы толькі ім. Без дапамогі мясцовых жыхароў Перамога наўрад ці была б магчымая».

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*

■ Аты-баты

# НА ВЕРНАСЦЬ АЙЧЫНЕ

## Як карэспандэнт «Звязды» прыняў воінскую прысягу

**Туманнай снежаньскай раніцай дзясяткі людзей выходзяць з аўтобуса і асабістых аўтамабіляў у сталічным мікрараёне Сосны і ідуць уздоўж плота ваеннага гарадка. Разам з імі крочым і мы. Дзень асаблівы і адказны — па ўсёй краіне тысячы ваеннаслужачых прамаўляюць словы на вернасць Айчыне. Нас жа цікавіць 2-я ордэна Чырвонай Зоркі інжынерная брыгада. У ёй прымаюць прысягу каля сотні ваеннаслужачых. 60 з іх служаць у рэзерве. Сярод іх — і фотакарэспандэнт «Звязды» Сяргей НІКАНОВІЧ, якога праводзілі ў войска напрыканцы лістапада.**



...Ён раптоўна з'яўляецца перад намі ў казарме з аўтаматам Калашнікава на грудзях. Адразу нават і не пазнаць яго ў нязвыклай цывільнаму воку ваеннай форме. Змяніўся за гэтыя некалькі тыдняў, пасталеў. Але радасны позірк адганяе прэч усе сумненні. У нас ёсць крыху часу да пачатку рэпетыцыі прысягі, і таму распытваем Сяргея пра яго жыццё ў войску.

— Цяпер мы праходзім курс маладога байца. Калі па праграме ў салдат тэрміновай службы восем гадзін заняткаў у дзень, то ў рэзервістаў — дзесяць. Але гэтае невялікае разыходжанне слаба заўважнае. Умовы побыту ў нас абсалютна аднолькавыя, робім усё ж гэтаксама. Што ўваходзіць у склад КМБ? Прыкладна трэць з вучэбнай праграмы — гэта страявая падрыхтоўка. Яна ў пэўнай ступені «разбаўляе» многія тэарэтычныя заняткі. Гэта важны элемент ва ўзаемадзеянні з саслужыўцамі.

Таксама рэзервісты вучылі агульнавайсковыя статуты і асаблівасці паводзін у баявых умовах. Сяргей ужо ведае сваю спецыяльнасць. Ён будзе камандзірам інжынерна-сапёрнага аддзялення.

— Вось літаральна напярэдадні прысягі ў нас былі заняткі ў спецгарадку. Цяпер вывучаем фартыфікацыйныя збудаванні. Напрыклад, траншэі, акопы, мінныя палі і ўсё, што мае да іх дачыненне — як затрымаць праціўніка на месцы і абараняцца ад яго. У першыя ж дні нам паказалі, як працаваць з узрывальнікамі, дэтанатарамі, шашкамі. За час працы ў газеце я шмат чаго пабачыў на свае вочы, але цікава было дачакацца таго моманту, калі сам навучышся ўсё гэта рабіць.

***— А як прайшоў у войску твой першы дзень?***

— Нас засялілі ў казарму ўвечары. Паказалі, як падшываць, як правільна засцілаць ложак. На наступны дзень усё гэта мы рабілі самі. Вучылі званні, парадак звароту. Даведаўся, што рота маладога папаўнення складаецца з пяці ўзводаў. Два з іх укамплектаваныя з салдат тэрміновай службы, тры — з рэзервістаў. Так аказалася, што ў маім узводзе сабралася ажно 15 праграмістаў і толькі адзін гуманітарый *(смяецца).* Рана ўставаць прызвычаіўся — наша ж работа такая, што выехаць у камандзіроўку можна і ў чатыры раніцы.

У многім характар службы залежыць ад таго, якім будзе сяржанцкі склад. Гэта ваеннаслужачыя 2-га і 3-га перыяду, якія з'яўляюцца намеснікамі камандзіраў узводаў. Яны вучаць нас усяму, нясуць за нас поўную адказнасць і тлумачаць кожны незразумелы момант. Тут як у школе: які настаўнік трапіцца, так і будзеш ведаць прадмет.

***— Чым ты займаўся ў асабісты час?***

— Рыхтаваўся да наступнага дня. Калі, напрыклад, прывёў хутка форму ў парадак — можаш пачытаць кнігу, пагартаць газету. І нам выдаюцца на гэты час тэлефоны. Яны мусяць быць без камеры, інтэрнэту і дыктафона.

***— А што з харчаваннем?***

— Думаў, калі пайду ў армію, то скіну кілаграмаў 5—10. А вось і не! Праз першы тыдзень стаў есці менш, каб не растаўсцець. На абед, напрыклад, у меню значыцца каша, катлета, суп, салат, булачка, масла, гарбата ці сок. На сняданак — шніцаль, грэчка, яйка...



Урачыстая раніца ў часці прадоўжылася бацькоўскім сходам, які вёў камандзір 2-й інжынернай брыгады палкоўнік Віктар ВЫРВІНСКІ. Родных цікавіў пераважна распарадак дня. Камандзір таксама папрасіў паведамляць кіраўніцтву часці ў любы час аб асабістых праблемах, якія ўзнікаюць у салдат.

І вось мы перамяшчаемся на пляц. Тут крыху цеснавата — на маленькім асфальтавым прамавугольнічку сабралася, па прыкідках, каля дзвюх соцень родных і блізкіх. Лавіруючы ў натоўпе, прабіраюся бліжэй да ўзвода, у якім служыць Сяргей. Адметна, што ён прамаўляе тэкст вайсковай прысягі па-беларуску. Да яго сёння прыехалі бацькі, малодшая сястра, дзед і двое сяброў. Вось да іх мы і кіруемся.

— А памужнеў як! — выгуквае мама Сяргея Ала Яўгенаўна. — Я не думала, што ён можа так адказна да ўсяго падыходзіць. У хатняй абстаноўцы ён больш разняволены. А тут статус абавязвае быць іншым. Усцешыла, што ён прысягнуў на матчынай мове.

— Мужчына павінен быць падцягнутым, дысцыплінаваным, — кажа дзядуля Яўген Канстанцінавіч. — Вы ж успомніце, як было раней, — дзяўчаты замуж не хацелі выходзіць за таго, хто не служыў у войску. Армія дрэннаму не вучыць. Я ж сам служыў тры гады ў ракетных войсках. І давялося яшчэ напрыканцы службы вучыць маладых.

Салдатам застаецца ўсяго некалькі хвілін да першага ў жыцці вайсковага звальнення. Сяргей кіруецца дадому, каб сустрэцца з роднымі за святочным сталом. На жаль, гэта ненадоўга — ён мусіць вярнуцца назад у часць у гэты ж дзень не пазней за 19.30. Яму яшчэ заступаць у першы нарад дняўальным.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
*schklennik@zviazda.by*
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ**

### У тэму

**Міністр абароны Беларусі Андрэй РАЎКОЎ наведаў у суботу 72-і аб'яднаны вучэбны цэнтр у Печах, што месціцца пад Барысавам. Ён там прыняў удзел у цырымоніі прыняцця прысягі.**

— Бацькі павінны разумець, што ёсць сувязь з камандзірамі, начальнікамі, Міністэрствам абароны, — адзначыў Андрэй Раўкоў. — Пазваніце — усе пытанні мы ўважліва разгледзім і прымем адпаведныя меры. Хацелася б, каб бацькі не тады, калі нешта здарыцца, крычалі на ўвесь голас, а рабілі ўсё загадзя. І гэта вельмі важна для нас.

Для прызыўнікоў прысяга — падзея ўсяго жыцця. Яны пераходзяць у зусім іншае асяроддзе, дзе толькі мужчынскі калектыў. У гэтым калектыве ім трэба мець зносіны, жыць, выконваць задачы. У хлопцаў цяпер самая цяжкая праца — праца над сабой.